**Шымуковіч, Ф.** Афганец / Ф. Шымуковіч // Міёрскія навіны. — 2011. — 19 сак. — С. 2.

# АФГАНЕЦ



У маленстве Віця Швядко любіў сядзець на каленях у дзеда Мікалая Фёдаравіча Лавейкі, слухаць аповеды пра вайну. А ў далёкім ужо 1984 годзе наспеў час, як кажуць, самаму выканаць воінскі абавязак. Пасля праходжання паскоранага курса маладога байца Віктара накіроўваюць у Афганістан.

Што засталося ў памяці салдата? У першую чаргу – боль.

– Страціў там лепшага сябра, – адзначае Віктар. – Сына ў яго гонар Аляксеем назваў. А потым... ведаеце, мы не героямі туды прыйшлі, а 18-гадовымі хлопцамі. Было цяжка і страшна. Памятаю, прыбылі з Кабула ў часць. Шмат параненых, іх стогны, кроў. Вайна зусім іншая, не такая, пра якую расказваў дзед, а тым больш не кіношная. Там перад табой праціўнік, фашыст, які прыйшоў забіваць цябе і тваіх родных. Там усё зразумела: наперадзе лінія фронта, за якой вораг. У Афгане ні фронта, ні тылу. У любы час сутак можна чакаць абстрэлу з гор, з населенага пункта, які выглядае так мірна. Вось ідзе быццам бы жанчына, якая закрыла твар пакрывалам, а аказваецца – душман з гранатамі і аўтаматам пад адзеннем. Да такога прывыкнуць нельга.

Віктар Швядко служыў ў дэсантнай штурмавой брыгадзе, быў снайперам, камандзірам аддзялення, памочнікам камандзіра ўзвода. Удзельнічаў у многіх баях з душманамі. Пра гэта ўспамінае з горкім жалем, бо ў кожнай сутычцы гінулі баявыя сябры – 18 і 19-гадовыя юнакі, якіх дома чакалі матулі і нявесты. Віктар не хаваўся за спінамі сваіх аднапалчан, але пра вайну на далёкай зямлі гаворыць з неахвотай. Ведае, што быў прадстаўлены да баявой узнагароды, але ўзнагародны ліст недзе згубіўся. Толькі не ва ўзнагародах шчасце. Праз два гады салдат жывым і здаровым вярнуўся дамоў, хаця за што ваявалі, за што гінулі ў баях маладыя салдаты, сказаць складана.

– Палітработнікі тлумачылі, – гаворыць Віктар, – што выконваем інтэрнацыянальны абавязак. Толькі чым мы былі абавязаны афганскаму народу – незразумела. Тым не менш выконвалі загад камандавання.

Пасля дэмабілізацыі паўстала пытанне, дзе працаўладкавацца. Бацька Віктара ўсё жыццё марыў служыць у міліцыі. На жаль, не атрымалася. Стаў прафесійным пажарным. Два месяцы пасля арміі былы салдат працаваў на заводзе, а потым уладкаваўся ў патрульна-паставую службу.

Суровая служба ў арміі загартавала Віктара. На твары – спакой, а за шырокімі плячыма – упэўненасць і сіла. Такія людзі выбіраюць жыццёвы шлях цвёрда, раз і назаўсёды. Віктар працягвае размову:

– Меркаваў, на новай службе ўсё проста. Аказалася, што памыляўся. У асяроддзі моладзі праяўляюцца нездаровыя тэндэнцыі. Якраз маладыя даюць негатыў у міліцэйскія зводкі – хуліганяць, крадуць і інш. Служба ў арміі заўсёды лічылася справай гонару. Не служыў – значыць, не мужчына. А цяпер пасля п’яных праводзін даводзіцца ў літаральным сэнсе з пасцелі выцягваць навабранцаў. Сорамна і незразумела. Нейкая частка моладзі не знаходзіць занятку. Як такое можа быць? У мяне, памятаю, не хапала часу: займаўся рукапашным боем, парашутным спортам.

Нядаўна затрымалі хлопца за хуліганства. Здаравяка, апрануты з іголачкі. Выклікалі бацьку. “Ну, я яму, лайдаку, дома пакажу, дзе ракі зімуюць!” А ў адказ лайдак гаркнуў: “Баця, глохні! Я дома з табой разбяруся!” І бедны бацька больш ні слова не прамовіў. Вось і атрымліваецца: выкладзе бацька значную суму штрафу з уласнага заробку, а сынок будзе гуляць і дэбашырыць далей.

Сям’я Швядко ў Дзісне вядомая і паважаная. Маці Віктара, Зоя Мікалаеўна, працавала бухгалтарам кансервавага завода, цяпер на пенсіі. Брат Леанід паспяхова закончыў сярэднюю школу, адслужыў у войску і ўладкаваўся ў камунальную службу. Лічыць, што Дзісну ніхто іншы не стане добраўпарадкоўваць. Ажаніўся.

Віктар разумеў, што працуючы ў праваахоўчых органах, патрэбна юрыдычная адукацыя. Вырашыў паступіць у акадэмію МУС. Не хапіла аднаго бала, а прыёмная камісія не звярнула ўвагу на службу ў Афгане, станоўчую атэстацыю з месца працы. Але гэта не выбіла з жыццёвай каляіны.

У пачатку 90-х намеснік камандзіра ўзвода патрульна-паставой службы Наваполацкага аддзела ўнутраных спраў, сяржант Швядко яшчэ раз даказаў, што ў міліцыю ён прыйшоў не выпадкова. Каля дзвюх гадзін ночы аўтапатруль “засёк” на вуліцы Маладзёжнай грузавік, які рухаўся з вялікай хуткасцю. На каманду спыніцца вадзіцель не адрэагаваў. Пачалася пагоня. На адным з паваротаў вадзіцель грузавіка не справіўся з кіраваннем, аўтамабіль выкінула на тратуар, а потым у лесапасадку. Маладыя бярозкі адляталі ў бок як падкошаныя. Рухавік заглох. Злачынец кінуўся наўцёк праз могілкі. Віктар з’арыентаваўся імгненна. Падаў каманду падначаленым: “Сяргей, Ігар! У абход!” А сам кінуўся наперарэз. Пралічваў варыянты. Уцякач не мог нікуды схавацца, павінен быў выйсці на людзей у пагонах. Віктар дабег да гаражоў, прыціснуўся да сцяны. Уцекача доўга чакаць не давялося. Неўзабаве ён выскачыў на міліцыянера. Заўважыўшы чалавека ў пагонах, развярнуўся ў другі бок. На вокліч: “Стой, страляць буду!” – не зрэагаваў. Віктар выстраліў у паветра. Уцякач спатыкнуўся і паваліўся. Вось той момант, які нельга ўпусціць. Кароткая схватка. Злачынец аказаўся не слабаком. У яго руках бліснуў нож. Міліцыянер зрабіў спробу выбіць халодную зброю. Атрымалася не зусім удала, лязо ўпілося ў нагу. Зразумеў гэта, калі адчуў рэзкі боль. Злачынец кінуўся да агароджы. Імгненна спрацавала думка – калі даць магчымасць пераскочыць агароджу — уцячэ. Не зважаючы на рэзкі боль, Віктар робіць рывок. Калі злачынец ускоквае на агароджу, прыцэльна страляе па нагах. Інтуіцыя падказала, што не прамахнуўся, бо ўцякач, нібы мяшок, плюхнуўся на другі бок агароджы.

З другога боку ўжо падбягалі Сяргей і Ігар. Хлопцы толькі што прыйшлі ў міліцыю, ні вопыту, ні зброі. Спрацавала афганская звычка – камандзір у адказе за здароўе і жыццё падначаленых. Зразумеў, што злачынец з бывалых і пры любой магчымасці пусціць у ход нож. Папярэдзіў падначаленых. Злачынец зразумеў, што з прастрэленай нагой яму не ўцячы, а

прымяненне ў другі раз нажа нічога добрага не прынясе. Быў абяззброены, са скразным раненнем галёнкі дастаўлены ў бальніцу. Там зрабілі перавязку нагі і Віктару.

Злачынец аказаўся раней судзімым, знаходзіўся ў вышуку. Сяргей і Ігар атрымалі заахвочванне, а на сяржанта Віктара Швядко афармілі дакументы на прадстаўленне да ўрадавай узнагароды. Зноў іронія лёсу. Саюз распаўся, а дакументы дзесьці пыляцца ў архівах.

Віктар Швядко можа ўспомніць яшчэ не адну падобную сітуацыю. Ён чэсна нёс службу па ахове мірнага жыцця грамадзян. У званні старшага прапаршчыка міліцыі пайшоў на заслужаны адпачынак. Толькі не можа спакойным быць чалавек, для якога жыццё абеззброены рухавік. І па сённяшні дзень Віктар працуе ў сістэме "Ахова" ў Навапалацку.

У памяць пра загінуўшага ў Афганістане лепшага сябра Аляксея ў сям'і Віктара расце сын Аляксей, студэнт Навапалацкага тэхнікума нафтахіміі.

Жыццё працягваецца.

**Ф. Шымуковіч**